праціўніку. Аднак Дзмітрый Іванавіч, сабраўшы свае войска і дружыны падуладных яму князёў, заняў усё Цвярское княства. Міхаіл Аляксандравіч павінен быў на працягу сямі тыдняў абараняцца. На дапамогу яму ішоў атрад, пасланы з Вялікага княства Літоўскага, але ён, убачыўшы вялікую маскоўскую сілу, вырашыў не ўступаць у бой і павярнуў назад. Зразумеўшы безнадзейнасць свайго супраціўлення, Міхаіл Аляксандравіч вымушаны быў прасіць міру ў Дзмітрыя Іванавіча, вынікам чаго і з'явілася поўная залежнасць Цверы ад Масквы[147].

Як бачым, вынікі Альгердавай «маскоўскай» палітыкі былі неаднолькавыя. Хоць ён і не атрымаў перамогі ў Пскове і Ноўгарадзе і не змог забяспечыць перавагі Цверы над Масквой, затое Смаленск апынуўся ў поўнай залежнасці ад Вялікага княства Літоўскага, а Бранск разам з усёй Севершчынай перайшоў пад уладу Альгерда.

З Усходу на Поўдзень

Хаця найбольшая ўвага Альгерда была скіраваная на адносіны з паўночнымі і ўсходнімі суседзямі, што найбольш адпавядала полацкай частцы дзяржавы, тым не менш з яго поля зроку не выпадалі і інтарэсы літоўскай, нёманскай часткі дзяржавы, у якой знаходзілася яе першая сталіца — Навагародак. Нам ужо вядома аб складаных узаемаадносінах паміж Навагародскай зямлёй і яе паўднёвымі суседзямі — Галіцка-Валынскімі князямі. Быў час (ён прыпадае ў асноўным на 1-ю палову XIII ст.), калі Навагародак павінен быў выконваць іх волю. Вызваліўшыся ад залежнасці ў 1258 г., а пасля і стаўшы сталіцаю новай дзяржавы Навагародак неаднаразова адбіваў напады на яго галіцка-валынскіх князёў, якія фактычна з'яўляліся яго галоўнымі знешнімі ворагамі. Нават яшчэ ў 1289 г. князі Будзікіт і Будзівіт вымушаныя былі аддаць валынскаму князю Ваўкавыск, каб толькі захаваць з імі мір.

Але ў выніку мангола-татарскай навалы і міжусобнага суперніцтва Галіцка-Валынская зямля траціць палітычнае адзінства і, як вынік гэтага, слабее і становіцца сама аб'ектам суперніцтва суседніх дзяржаў за ўладу над ёю. Каля 1325 г. валынскім князем становіцца Гедзімінаў сын Любарт, а гэта азначала, што Валынь стала часткаю Вялікага княства Літоўскага. І, вядома ж, гэта найперш было перамогаю для Навагародскай зямлі.

Аднак валоданне Валынню для Вялікага княства Літоўскага было нялёгкаю справай, паколькі супернікам яго стала Польшча, якая таксама лічыла сябе законнай спадкаемніцай Галіцка-Валынскай зямлі. У выніку барацьбы Любарта, якому дапамагаў і Альгерд, з польскім каралём Казімірам і мазавецкім князем Земавітам у 1347 г. было заключана перамір'е, паводле якога толькі Львоўская зямля заставалася за Польшчай, а ўсе астатнія (Уладзімірская, Луцкая, Холмская, Бельская і Берасцейская — за Вялікім княствам, якое такім чынам атрымала значную перавагу. Гэта не магло задавальняць Польшчу. Таму па заключэнні перамір'я ў 1349 г. Казімір зноў распачаў вайну. У выніку імклівых дзеянняў ён захапіў Холмскую і Бельскую землі, а таксама ўсю Валынь і Берасцейскую зямлю, якая яшчэ пры Гедзіміне знаходзілася ў складзе Вялікага княства. Самому ж Любарту ён прапанаваў толькі Луцкую зямлю і то ў якасці леннага валодання[148].

У сваю чаргу Любарт з дапамогаю Кейстута ў наступным 1350 г. адваяваў Валынь, выгнаўшы адтуль польскія гарнізоны і разбурыўшы крэпасці, якія пачалі ўзводзіць палякі, а пасля перайшлі ў далейшы наступ, зваяваўшы Львоўшчыну, а таксама і сумежныя польскія землі — Сандамірскую, Радамскую і Лукаўскую[149]. Казімір, апынуўшыся ў цяжкім становішчы, вымушаны быў шукаць падтрымкі. Асабліва характэрны яго зварот да рымскага папы Казіміра VI. З мэтаю напалохаць святы пасад ён прадставіў становішча так, нібыта яго землямі завалодалі язычнікі. Але ўжо тое, што на Валыні князем быў праваслаўны Любарт, яшчэ раз красамоўна абвяргае ўяўленне аб Вялікім княстве Літоўскім як язычніцкай дзяржаве. І ўсё ж менавіта такі погляд на гэтую дзяржаву і выкарыстоўваўся для дасягнення вайскова-палітычных мэтаў супраць яе. У дадзеным выпадку гэта мела свае вынікі: Клімент VI

дазволіў польскім біскупам аб'явіць крыжовы паход супраць Вялікага княства і аднačасова даў Казіміру дазвол выдаткоўваць дзесятую частку царкоўных даходаў на барацьбу з язычнікамі. Істотнай падтрымкаю для Казіміра быў і яго саюз з венгерскім каралём Людовікам.

З свайго боку і Альгерд знайшоў сабе саюзнікаў у асобе татараў, якія валодалі Падоллем. Як бачна, у вайну былі ўцягнутыя значныя сілы, таму яна і доўжылася яшчэ пяць гадоў. Спачатку поспех быў за палякамі, якія зноў захапілі Валынь, і нават палонілі Кейстута, які, праўда, у хуткім часе здолеў уцячы.

Узяты ў Луцку ў аблогу, Любарт таксама мог трапіць у палон, але змог выбрацца з варожага кола. Перамена ў вайсковых дзеяннях на карысць Вялікага княства Літоўскага адбылася тады, калі на дапамогу сваім братам прыйшоў з войскам Альгерд. Іх аб'яднаныя палкі робяць набегі на Польшчу і Мазовію, выганяюць польскія гарнізоны з гарадоў Валыні і робяць спробу захапіць Галіцкую зямлю. Любарт нават быў захапіў Галіч, аднак, не ўтрымаўшы яго, вымушаны быў адступіць, разбурыўшы замкі і захапіўшы вялікую здабычу. Відаць, на гэтым у 1356 г. і закончылася вайна паміж Польшчаю і Вялікім княствам. На жаль, умовы міру не захаваліся. Дайшла толькі да нас асобная дамова, заключаная паміж Кейстутам (ад імя Альгерда і іншых князёў) з аднаго боку, і Мазовіяй — з другога. Яна найперш цікавая тым, што, паводле яе, Берасцейская зямля зноў пераходзіць да Кейстута, гэта значыць становіцца часткаю Вялікага княства Літоўскага[150]. І хоць барацьба за Валынь не скончылася, гэтым разам зыход яе быў, па ўсім відаць, на карысць Вялікага княства, што Альгерд выкарыстаў для далейшага пашырэння абшару сваёй дзяржавы ў паўднёвым накірунку.

Праўда, гэта адбылося не адразу, бо, як ужо адзначалася, з 1357 г. пачалося ўмяшанне Альгерда ва ўзаемаадносіны паміж Маскоўскім і Цвярскім княствамі. Тым не менш, у 1362 г. Альгерд ажыццявіў свой імклівы рэйд на Падолле. Яно ў той час знаходзілася пад татарскаю ўладай, але ўжо было незалежным ад Залатой Арды, якая знаходзілася ў стане распаду. Мы ўжо ведаем, што ў 1356 г. польскія татары былі на баку Альгерда, гэтак жа, як і ў 1351 г. Прычынаю такіх

дружалюбных адносін з'яўлялася тое, што Польшча прэтэндавала не толькі на Галіцыю, але і на Падолле. І гэта, вядома, рабіла татарскіх уладароў саюзнікамі Альгерда. Аднак у 1356 г. Казімір пачаў перамовы з татарскімі князямі Падолля, задобрыў іх багатымі дарункамі, і гэта дало свае вынікі: сем татарскіх уладароў Падолля перайшлі на бок Польшчы супроць Альгерда[151]. Такая рэзкая змена ў пазіцыі татараў і дала Альгерду падставу таксама змяніць свае адносіны да іх, што і выявілі падзеі 1362 г. На жаль, гэтая важная падзея вельмі скупа, а то і заблытана (як у «Хронікі Быхаўца»)[152] пададзена ў крыніцах. Больш поўнае і дэталёвае яе асвятленне мы знаходзім у «Хронікі Літоўскай і Жмойцкай»[153].

У шэрагу крыніцаў сказана толькі, што Альгерд у гэтым паходзе атрымаў вырашальную перамогу на р. Сінія Воды над трыма татарскімі князямі Падолля: Кутлубугам, Хаджыбегам і Дзмітрыем (незразумела, чаму гэты апошні насіў хрысціянскае імя; магчыма, зразумеў, што над хрысціянамі лепш будзе ўладарыць, перайшоўшы ў іх веру). У «Хронікі Літоўскай і Жмойцкай» гэтая падзея перададзена так: «Ольгерд... выправился против татаров в Поля Дикие; тягнули теж з ним и чотыри его сыновци Кориятовичи: Александр, Константин, Юрий, Феодор — Корията, князя новгородского сынове. А гды пришли до Синей Воды, минувши Канев и Черкасы, указался им в полю великая орда з трома цариками на три обозы разделеныи, то есть Котлубая, Катибея, Бекера и Дмитра солтана. То обачивши, Ольгерд, же до войны готовы татаре, разшиковал войско свое на шесть гуфов закривленых з боков и на чоло розсадивши, абы их татаре танцами звыклыми огорнути и стрелами шкодити не могли. А потом з великою запалчивостю татаре град железный з луков на литву густо пустили, але им стрелбою не зашкодили, для порядного ушикования и прудкого розступеня. Литва зас з русю скочила зараз з копиями и шаблями, потыкаючися, чоло им перервали и танцы помешали, другие зас з куш белтами, а звлаща новгорожане з Кориятовичами и валили их з коней, натираючи на них з боков, летали не иначей як снопы от гвалтовного ветру татаре разбурены, а не могучи болш литвъ на чолъ вытрвати, почали мешатися и утекати по

широких полях. Там же цариков их трох: Котлубая, Катибея, Бекера — забито, от Мурзов и уланов побито велми много, трупов тежь татарских полны поля и реки были, стад килкадесят, верблюдов, обозы их, в которых всю маетность звыкли свою татаре з паши на пашу возити...»[154].

Мы падалі гэтую вытрымку з летапісу, бо яна найбольш поўна і праўдзіва сведчыць аб выдатнай падзеі нашай гісторыі. Апрача таго, яна дае нам дэталёвае апісанне бітвы, тактыкі бою як Альгерда, так і татараў, што можа мець вялікую цікавасць для гісторыкаў вайсковай справы. Характэрна і тое, што тут татарскія ўладары называюцца царыкамі, што вельмі добра адлюстроўвае мізэрнасць абсягаў іхняе ўлады.

Але для нас асабліва важна звярнуць увагу на тое, што ў паходзе ўдзельнічалі новагародскія князі Карыятавічы — Аляксандр, Юрый, Канстанцін і Фёдар. У «Хронiцы Быхаўца» таксама паведамляецца аб гэтым, але вельмі заблытана. Паводле гэтай крыніцы, Альгерд узяў толькі трох Карыятавічаў, а чацвёрты, Фёдар, з'явіўся ў Падоллі толькі пасля смерці трох сваіх братоў, але быў выгнаны князем Альгердам[155]. Аднак у сапраўднасці ў паходзе разам з Альгердам бралі ўдзел усе Карыятавічы. І самае важнае, што яны складалі галоўную апору Альгерда і адыгралі галоўную ролю ў перамозе. Таму становіцца зразумелым, чаму Альгерд, вяртаючыся дадому з часткаю войска, «другую часць в Подолю оставил, под которым войском приложил сыновцов своих князей новгородских Кориятовичей Александра, Константина, Юрия и Федора, и все краины Русские с Подолем поручил им и дал в панованне»[156]. Усё паказвае, што названы паход, як і барацьба за Валынь, быў найперш у інтарэсах Новагародка, і таму ў ім удзельнічалі новагародскія князі з сваім войскам, якім і былі аддадзены ва ўладанне ўсе заваяваныя землі. Такім чынам, хаця Новагародак і страціў сваё сталічнае становішча, аднак ён не страціў дзяржаўнай значнасці. Нездарма ж і цяпер прызначэнне князя на новагародскі пасад суправаджалася яго каранаваннем, як гэта было з Карыятам[157] у 1327 г. Новагародак, як і Полацк, дыктаваў сваю палітыку вярхоўнай уладзе, вынікам чаго і з'явіўся паход Альгерда ў Падолле.

Дарэчы, і тут летапіс паказвае, што пад назваю

«Літва» тут хаваецца не сучасная Літва, а Новаградчына. Гэта добра бачна з таго, што Карыятавічы адначасова называюцца і новагародскімі, і літоўскімі князямі — як, напрыклад, там, дзе гаворыцца пра будаўніцтва ў Падоллі замкаў[158].

Заваяванне Падолля вызначыла і лёс Кіеўскага княства. Акружанае з усіх бакоў уладаннямі Альгерда, і яно, натуральна, павінна было перайсці пад яго ўладу, што і адбылося без барацьбы. Аб гэтай падзеі гаворыцца вельмі коратка і то толькі ў Густынскім летапісе: «Сей Ольгерд и иншия Руския державы во свою власть принят, и Киев под Фёдором князем взят, и посади в нем Володимера сына своего, и начи над сим владети»[159]. Заваяванне Кіеўшчыны Альгердам было адначасова і вызваленнем яе, як і Падолля, ад татарскай няволі. Летапіс паведамляе пра тое, што Альгерд гэтым землям «от татаров вольность учинил»[160]. Менавіта князь Фёдар, якога замяніў Альгердаў сын Уладзімір, быў фактычна падручным хана Залатой Арды. Аднак тая ўжо занепадала, таму і не зрабіла ніякіх захадаў у адказ на тое, што Альгерд адабраў ад яе «ўлусы». Гэта добра сведчыць, наколькі прадбачлівым палітыкам быў Альгерд, наколькі ўдала ён мог выбраць момант для дзеянняў.

Калі барацьба за Падолле і Кіеўшчыну закончылася паспяхова, то змаганне за Валынь зноў аднавілася. Польскі кароль Казімір, выкарыстоўваючы ўдзел Альгерда ў цвярскіх справах, у 1366 г. зноў зрабіў паход на Валынь з мэтаю яе падначалення Польшчы. Спачатку яму ўдалося заняць Белз і Холм, князь якіх Юрый Нарымонтавіч, не маючы дастатковых сіл для супраціўлення, вымушаны быў прызнаць уладу Казіміра. Потым польскія войскі занялі і іншыя гарады Валыншчыны — Уладзімір і Крамянец былі таксама аддадзеныя ў плен Аляксандру Карыятавічу, і толькі Луцк з акругамі застаўся за Любартам. Для нас асабліва важна адзначыць, што па ўмове, якая была заключана ў гэты час, польскі кароль назаўсёды прызнаваў Берасцейскую зямлю ўладаннем Вялікага княства Літоўскага[161].

Аднак і на гэтым барацьба за Валынь не закончылася. Яна працягвалася яшчэ доўгі час у выглядзе спусташальных набегаў войск Вялікага княства на суседнія польскія землі. І толькі ў 1377 г., калі новы польскі

кароль Людовік зноў са сваім войскам прыйшоў на Валынь, у час доўгай аблогі Белзы быў заключаны мір, па якому Берасцейская, Уладзімірская і Луцкая землі прызнаваліся за Вялікім княствам Літоўскім, а Холмская і Белзская — за Польшчай[162].

Асоба Альгерда

З разгледжанага вышэй выразна відаць, што Альгерд як да 1345 г., калі ён быў крэўскім і віцебскім князем, так і пасля, калі ён стаў вялікім князем літоўскім, найперш і галоўным чынам выступае як беларускі дзяржаўны дзеяч. З гэтым шчыльна звязана і пытанне аб яго веравызнанні. У ранейшай гістарычнай літаратуры большасць аўтараў схілялася да думкі, што Альгерд быў язычнікам. Падставаю былі паведамленні храністаў Г. Вартберга і Я. Длугаша аб яго язычніцтве да самай смерці і аб спаленні яго цела на вогнішчы. Але заходнія аўтары былі зацікаўленыя ў пашырэнні ўяўлення пра Вялікае княства Літоўскае як пра язычніцкую дзяржаву і пра яе вялікіх князёў — як язычнікаў, што апраўдвала экспансіяністкія дзеянні Ордэна і Польшчы, якія прыкрываліся лозунгамі пашырэння хрысціянства. Аднак абсурднасць сцверджанняў аб язычніцтве Альгерда найперш выяўляецца фактам ягонага 25-гадовага княжання ў Віцебску. Вядома, што ў гэтым горадзе, як і ў Полацку, ці іншых беларускіх гарадах, не мог уладарыць язычнік. Ва ўсялякім разе, крыніцы не даносяць да нас ніводнага такога факта. Апроч таго, як паведамляе Ніканаўскі летапіс, на просьбу пскоўцаў хрысціцца і быць у іх князем, Альгерд адказаў, што ён ужо хрышчоны[163]. Малаверагодна, што пры нараджэнні Альгерд не быў ахрышчаны. Яго маці была праваслаўная і наўрад ці магла яна пагадзіцца з тым, каб яе сын быў нехрысцем. Ды і язычніцтва самога Гедзіміна, як ужо адзначалася намі раней, з'яўляецца вельмі праблематычным.

Пра язычніцтва Альгерда не можа сведчыць і яго імя. Мы ўжо ведаем, што ў княскіх родах, у тым ліку і полацкіх, дзецям давалі па два імя: княскае і хрысціянскае. Дык вось імя Альгерд і было княскім, а не язычніцкім. Хрысціянскае ж імя Альгерда было Андрэй (заслугоўвае ўвагі, што свайму першаму сыну, будучаму полацкаму князю, ён даў гэткае ж імя). А перад смерцю, па настаянню жонкі Юльяны, Альгерд прыняў схіму, а з ёй і імя Аляксей[164].

Вядома ж, і стаўшы вялікім князем, ён не мог перайсці ў язычніцтва, бо ў тым не было ніякай патрэбы. Ён па-ранейшаму быў выразнікам інтарэсаў усходняй хрысціянскай часткі дзяржавы. Факты пацвярджаюць, што як у Віцебску, так і ў Вільні ён паводзіць сябе як хрысціянін, чаму не ў малой ступені садзейнічала і тое, што яго жонкі Марыя Віцебская і Юльяна Цвярская былі вельмі набожнымі хрысціянкамі. Гэта наглядна выявілася ў будаванні праваслаўных храмаў. Так, у Віцебску ім былі пабудаваныя цэрквы Дабравешчанская і Святога Духа. Не выключана, што пазней, дзякуючы падабенству імёнаў Ольгі і Альгерда, пабудова цэркваў у Віцебску была прыпісаная княгіні Вользе[165], тым больш што ў 974 г. яна гэтага зрабіць не магла, бо яе ўжо не было ў жывых. Пераезд Альгерда ў Вільню таксама адзначаны пабудоваю двух храмаў, прычым першы з іх быў узведзены на месцы язычніцкага капішча. Ніяк не можа сведчыць пра язычніцтва Альгерда і гісторыя з трымя язычнікамі. Яны былі пакараныя смерцю не па загадзе Альгерда, а паводле патрабаванняў да яго язычнікаў. Раней ужо адзначалася, што язычніцкія імёны гэтых людзей, якія пасля былі абвешчаныя святымі — Кумец, Круглец і Няжыла — сведчаць аб прыналежнасці іх носьбітаў да славян. Трэба думаць, што на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага, дзе яшчэ мелася нямала язычнікаў, у тым ліку і ў Вільні, былі язычнікі-славяне з заходніх славянскіх земляў, што ўцякалі ад анямечвання і хрысціянізацыі. Менавіта яны маглі найбольш фанатычна берагчы веру сваіх продкаў і таму так жорстка абышліся з адступнікамі.

Бясспрэчна, што Альгерд з'яўляецца адным з найвыдатнейшых дзеячаў у нашай гісторыі. Гэтаму адпавядае нават яго знешні выгляд, апісанне якога знаходзім у адной нямецкай хроніцы: «Князь мае велічны выгляд, твар яго румяны, прадаўгаваты, нос яго вызначаўся сваёй велічынёй, вочы блакітныя, вельмі вострыя, бровы густыя, светлыя, валасы і барада светла-русыя з сі-

візною, лоб высокі, росту ён вышэй сярэдняга, не тоўсты, не худы, гаворыць голасам гучным, разборлівым і прыемным, ён выдатна ездзіць верхам, але ходзіць накульгваючы на правую нагу, таму звычайна апіраецца на кій ці на отрака; па-нямецку разумее выдатна, можа свабодна гаварыць, аднак заўсёды гаворыць з намі праз перакладчыка»[166].

Галоўны вынік княжання Альгерда — у выключным пашырэнні тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага, якое стала адной з найбольш вялікіх дзяржаў Еўропы. У ёй беларускія землі, канчатковае аб'яднанне якіх таксама закончылася ў гэты час, займалі цэнтральнае месца, што яшчэ ў большай ступені забяспечвала ім дамінуючае становішча. Гэта і давала магчымасць вызначаць галоўныя кірункі як унутранай, так і знешняй палітыкі Вялікага княства Літоўскага.

Ягайла і Андрэй Полацкі

Унутраная палітычная раўнавага, якая стварылася ў Вялікім княстве Літоўскім пры Альгердзе, адразу парушылася пасля яго смерці. Ужо тое, што вялікакняскі пасад перайшоў да Ягайлы — старэйшага сына Альгерда ад другой яго жонкі Юліяны — не магло не выклікаць пачуцця незадаволенасці ў каго-небудзь з іншых яго дванаццаці сыноў. Апроч таго, нельга забываць і аб браце Альгерда — Кейстуце, які быў фактычна самым старэйшым у родзе Гедзімінавічаў і меў найбольшае права заняць вялікакняскі пасад пасля смерці свайго старэйшага брата. Усё гэта ў хуткім часе і дало вынікі.

Нельга, вядома, адмаўляць уплыву Юльяны на рашэнне Альгерда пасля смерці пакінуць вялікакняскі пасад за Ягайлам. Звычайна шэраг даследчыкаў характарызавалі Ягайлу выключна адмоўнымі рысамі. Ён, маўляў, быў лянівы, нядбалы, бесхарактарны, схільны да раскошы і нічога не зрабіў дзеля дабра сваёй краіны[167]. Але ўсё гэта зыходзіла з памылковага ўяўлення

аб Крэўскай уніі як падзеі, якая толькі задавальняла асабістыя амбіцыі Ягайлы.

Далейшыя падзеі пакажуць, што Ягайла не быў такой безаблічнаю асобай, як яго імкнуліся паказаць, а, наадварот — валодаў якасцямі, патрэбнымі для дзяржаўнага дзеяча. Трэба думаць, што такія якасці бачыў у ім і Альгерд. Зноў-такі Ягайлу дастаўся не толькі вялікакняскі пасад, што адначасова рабіла яго як уладаром Віленскага ўдзелу, так і вотчынных уладанняў Альгерда — Крэўскага і Віцебскага. А гэта спалучала ў асобе Ягайлы агульныя інтарэсы дзяржавы найперш з інтарэсамі яе ўсходняй часткі.

Няма чаго казаць, наколькі дарагім для Альгерда быў яго старэйшы сын ад першай жонкі — Марыі Віцебскай — Андрэй. Відаць, толькі дасягнуўшы паўналецця (ён нарадзіўся дзесьці каля 1320 г.), Андрэй стаў верным памочнікам бацькі ў яго дапамозе Пскову супроць крыжакоў і, як нам вядома, быў абраны пскоўскім князем. Гэтак жа сама Альгерд, стаўшы вялікім князем у пскоўска-наўгародскіх, смаленскіх, маскоўскіх цвярскіх справах у вялікай меры абапіраўся на сілы Андрэя, паколькі ўсё гэта вызначалася найперш інтарэсамі Полаччыны. І вядома ж, на плечы Андрэя клаўся цяжар барацьбы з крыжакамі, якія не спынялі сваіх нападаў на Полацкую зямлю. Тым больш што полацкі князь не толькі абараняўся, але і наступаў, пра што сведчаць яго два паходы на Дынабург у 1373—1374 гг.

Вясною 1375 г. Андрэй у саюзе з Кейстутам і іншымі князямі робіць паход на лівонцаў, якія перад гэтым нападалі на Жамойць. У сваю чаргу, крыжакі, помсцячы Андрэю за яго набегі на іх землі, напалі на Полацкую зямлю, узяўшы ў палон 86 чалавек і захапіўшы 100 коней. Гэта таксама не прайшло без пакарання з боку Андрэя, і ён зрабіў паход на Дынабург. Цікава адзначыць, што полацкае войска часткова ішло на конях, часткова на караблях[168]. Відаць, такой была тактыка палачанаў, бо гэтак жа сама ішло іх войска на Рыгу ў 1203 г.

Усё адзначанае характарызуе Андрэя як выдатнага дзяржаўнага дзеяча і таленавітага палкаводца. (Апошняе асабліва пацвердзяць далейшыя падзеі.) Вядома ж, гэта давала яму падставу для атрымання пасля бацькавай смерці вялікакняскага пасаду, не гаворачы ўжо пра

тое, што ён гэта права меў як старэйшы сын. Аднак яго надзеі не спраўдзіліся, вялікакняскую годнасць атрымаў старэйшы сын другой Альгердавай жонкі — Юльяны. Зразумела, што такі выбар быў прадыктаваны не толькі Юльянай. Бачачы ўсе вартасці Андрэя, Альгерд разумеў, што пераезд яго з Полацка ў Вільню пацягне за сабою вялікія ўскладненні для Андрэя, які трапіць у непрыязнае для яго асяроддзе Ягайлы, што, у сваю чаргу, пацягне за сабой ускладненні ва ўсёй дзяржаве.

Аднак без барацьбы не абышлося. Не выключана, як лічаць некаторыя даследчыкі[169], што Андрэй выклаў Ягайлу свае прэтэнзіі, але той не згадзіўся з гэтым, што і выклікала рашучую барацьбу паміж імі. Але найверагодней, што, наадварот, Ягайла выставіў Андрэю прэтэнзіі на падначаленне яму Полацка. Рэч у тым, што Альгерд, аддаўшы Ягайлу ўсе свае ўладанні, не аддаў яму Полацка. Зразумела, што пры Альгердзе яго адносіны з Андрэем лёгка ўзгадняліся і рэгуляваліся. Аднак тое, што без цяжкасцей рабілася паміж бацькам і сынам, не магло захавацца ва ўзаемаадносінах братоў. Відаць, Ягайла запатрабаваў ад Андрэя падначалення сваёй уладзе, на што той не згадзіўся. Гэтым можна вытлумачыць тое, што актыўныя дзеянні распачаў не Андрэй, а Ягайла, войска якога ў 1377 г. падышло да Полацка і ўзяло яго ў аблогу. Нельга абысці ўвагай і тое, што ў саюзе з Ягайлам супроць Андрэя выступіў Кейстут. Як пакажуць далейшыя падзеі, для яго таксама было важным пазбавіцца яшчэ аднаго прэтэндэнта на вялікакняскі пасад.

Адрэзаны ад сваіх братоў і не маючы магчымасці перацягнуць іх на свой бок, Андрэй вымушаны быў звярнуцца да лівонскага магістра, які неўзабаве і пайшоў на дапамогу полацкаму князю, што і прымусіла Ягайлу і Кейстута, якія збаяліся ўступіць у бой з крыжакамі, зняць аблогу і адступіць ад Полацка[170]. Здавалася б, пагроза для Андрэя мінулася, і ён мог свабодна сядзець у Полацку. Аднак — і тут тоіцца нейкая загадка — гэтага не здарылася, Андрэй пакідае Полацк і ідзе ў Пскоў[171]. Відаць, Андрэй разумеў ненадзейнасць абароны немцаў, хаця яны забяспечвалі яму бесперашкодны шлях у Пскоў. Але і там Андрэй знаходзіўся нядоўга. Можна думаць, што ён не атрымаў падтрымкі для барацьбы з Ягайлам і вымушаны быў шукаць

больш моцнага саюзніка, што і прывяло яго ў Маскву[172]. Аднак мы не маем ніякіх сведчанняў аб намеры Дзмітрыя Іванавіча дапамагаць Андрэю ў яго змаганні з Ягайлам. Затое добра бачна выкарыстанне маскоўскім князем вайсковага таленту Андрэя. У 1378 г. ён удзельнічае ў бітве на р. Вожы супроць войска татарскага хана Мамая[173]. Аднак самым дзіўным фактам у вайсковай біяграфіі Андрэя з'яўляецца ягоны ўдзел у паходзе маскоўскага войска на северскія гарады Трубчэўск і Старадуб, г. зн. тыя самыя, што побач з іншымі гарадамі гэтай вобласці далучыў да Вялікага княства Літоўскага яго бацька Альгерд. Як можна вытлумачыць такі ўчынак Андрэя, улічваючы выказанную думку, што ініцыятарам гэтага паходу і быў Андрэй[174]. Такое цалкам магчыма, бо гэта найперш шкодзіла прэстыжу Ягайлы, які, маўляў, не змог зберагчы ў цэласці тэрыторыю сваёй дзяржавы. Відаць, прыхільнікам Андрэя і праціўнікам Ягайлы быў і Дзмітрый Альгердавіч, які добраахвотна здаў Трубчэўск, у якім княжыў, што разам са Старадубам і іншымі гарадамі перайшоў пад уладу Масквы (узамен Трубчэўска Андрэй атрымаў Пераяслаўль)[175].

Ягайла, зразумела, не мог змірыцца са стратаю часткі сваёй дзяржавы, што не магло не прывесці яго да канфлікту з Маскоўскім княствам. Паколькі Ягайла разумеў, што для непасрэднай барацьбы з Масквой сіл у яго замала, ён стаў чакаць прыдатнага моманту, які ў хуткім часе і надарыўся. Татарскі хан Мамай, збіраючыся ўвайсці ў барацьбу з маскоўскім князем Дзмітрыем Іванавічам, запрасіў да сябе ў саюзнікі Ягайлу, які на гэта даў згоду. Аднак калі маскоўскае і татарскае войскі зышліся на Кулікавым полі і калі паміж імі адбывалася бітва, Ягайла, які з сваім войскам знаходзіўся недалёка, не ўступіў у яе на баку Мамая, што ў вялікай меры і прывяло апошняга да паражэння. Тлумачэнні гэтага факта зроблены былі розныя. Аднак нельга пагадзіцца ні з тым, што ён спазніўся прыйсці, ні з тым, што ён не ўступіў у бой праз сваю баязлівасць. Нішто яму не перашкаджала своечасова прыйсці на дапамогу Мамаю, і не быў ён баязліўцам (гэта паказвае яго ўдзел у барацьбе з крыжакамі). У апошні час было выказана меркаванне, што паколькі яго войска ў асноўным складалася з праваслаўных беларусаў, то яны і не дазволілі

Ягайлу ісці супроць адзінавернай Масквы ды яшчэ ў саюзе з татарамі[176]. Аднак з гэтым згадзіцца ніяк нельга. Па-першае, гэта не адзначана ў крыніцах. Па-другое, становіцца незразумелым, чаму адзінаверныя княствы вялі міжусобную барацьбу паміж сабой, чаму адзінаверныя з Масковіяй разанцы дазволілі свайму князю Алегу ўступіць у саюз з Мамаем. У той час палітычныя інтарэсы таксама бралі верх над рэлігійнымі.

Прычыну ўстрымання Ягайлы ад удзелу ў Кулікоўскай бітве і трэба шукаць у яго палітычных разліках. Ягайла фактычна справакаваў гэтую падзею, бо без яго згоды ўвайсці ў саюз Мамай наўрад ці адважыўся б павесці свае войска супроць Масквы. Асабліва калі ён убачыў, што Ягайла вядзе свае войска яму на дапамогу. Але менавіта гэта і было галоўным у палітычным манеўры Ягайлы. Войска то ён вёў, але ўводзіць яго ў бой не сабіраўся. Яму важна было сутыкнуць маскоўскае і татарскае войскі паміж сабою. Ён прадбачыў, што, незалежна ад таго, хто пераможа, усё роўна абодва бакі будуць аслаблены. І сапраўды, хоць Масква і перамагла, аднак вельмі дарагой цаной. І, наогул, значэнне падзеі ў гісторыі вельмі перабольшана. Варта толькі нагадаць, што яшчэ цэлае стагоддзе пасля яе пратрымалася татарская няволя над Руссю. Такім чынам, справакаваўшы Мамая на паход, Ягайла меў на мэце аслабіць Маскву чужымі рукамі і тым самым захаваць свае сілы, што яму і ўдалося.

Нельга пакінуць без увагі тое, што ў Кулікоўскай бітве на баку Дзмітрыя Іванавіча прынялі ўдзел Андрэй і Дзмітрый Альгердавічы. Ужо тое, што першаму з іх быў даручаны полк «правай рукі», а другому — «левай рукі», гаворыць аб іх вялікай ролі ў перамозе над татарамі. Выказана і меркаванне, што Андрэй Полацкі прыйшоў на поле Кулікова і з палачанамі[177]. Аднак, як сведчаць крыніцы, ён прыйшоў туды толькі «со псковичи»[178].

А цяпер звернемся да падзей у Полацку пасля ад'езду з яго князя Андрэя. Захапіўшы гэты горад, Ягайла далучыў яго да сваіх уладанняў, пра што сведчыць дагавор аб перамір'і, заключаны Ягайлам з Лівоніяй 27 лютага 1381 г. А гэта яшчэ раз можа пацвярджаць, што менавіта з імкнення Ягайлы падначаліць сабе Полацк і пачалася барацьба паміж ім і Андрэем, якому,

магчыма, было прапанавана быць толькі намеснікам вялікага князя ў Полацку, на што Андрэй не пагадзіўся. І сапраўды, у 1381 г. Ягайла паслаў туды сваім намеснікам брата Скіргайлу. Аднак палачане адмовіліся яго прыняць і з ганьбаю, пасадзіўшы на каня задам наперад, адправілі назад. Ёсць меркаванне, што палачане адмовіліся ад Скіргайлы таму, што ён быў язычнікам, якога хацеў ім назначыць такі ж князь язычнік Ягайла. Прыняцце хрышчэння апошнім нібыта было выклікана ўдзелам у падзеях Кулікоўскай бітвы. Факт пераходу з язычніцтва ў хрысціянства князёў Вялікага княства Літоўскага тлумачыцца тым, што яны насілі падвойныя імёны. Першае з якіх, маўляў, язычніцкае, а другое — хрысціянскае: Ягайла — Якаў, Скіргайла — Іван, Карыбут — Дзмітрый і г. д.[179]. Аднак гэты довад непераканаўчы. Вядома, што ў кіеўскіх дынастыях дзецям пры нараджэнні даваліся два імёны: першае — княскае, другое — хрысціянскае. Так было ў кіеўскіх князёў, напрыклад, Яраслаў Мудры меў, апрача княскага, імя Георгій. Тое ж самае было і ў полацкіх князёў. Так, адзін з сыноў Усяслава Чарадзея меў княскае імя Рагвалод і хрысціянскае Барыс. Гэту традыцыю прадаўжалі і вялікія літоўскія князі, якія, што мы ўжо ведаем, паходзяць з дынастыі полацкіх князёў, чым і тлумачацца іх падвойныя імёны. А з гэтага вынікае, што Скіргайла не быў прыняты палачанамі не таму, што ён быў язычнікам. Справа, відаць, у тым, што палачане засталіся па-ранейшаму адданымі Андрэю, які, нягледзячы на яго вялікую дапамогу Дзмітрыю Данскому, не атрымаў ад таго ніякай падтрымкі для барацьбы з Ягайлам і вымушаны быў аднавіць свае ранейшыя сувязі з палачанамі. Апошнія, згадзіўшыся на гэта, варожа сустрэлі Скіргайлу.

Але Ягайла не адмовіўся ад намеру ва ўсёй моцы падначаліць сабе Полацк і таму зноў паслаў князем Скіргайлу, але ўжо з вялікім войскам. Нягледзячы на аблогу свайго горада, палачане і гэтым разам не здаліся. Тады Скіргайла звярнуўся па дапамогу да Лівонскага ордэна. Але прастаяўшы на беразе Дзвіны 11 дзён, крыжакі не змаглі прарвацца ў горад і мусілі ні з чым вярнуцца назад.

У гэты крытычны для сябе момант палачане вымушаны былі шукаць падтрымку ў ноўгарадцаў, аднак тыя, не даўшы вайсковай дапамогі, накіравалі да Ягай-

лы пасла Юрыя Анцыфаравіча. Магчыма, ён паведаміў аб небяспецы, якая чакае яго ад ноўгарадцаў у выпадку далейшай аблогі Полацка. І таму войскі Ягайлы, не ўзяўшы горада, павінны былі адступіць[180]. Не будзем адмаўляць значэння дыпламатычных захадаў Ноўгарада ў зняцці блакады Полацка, і ўсё ж, відаць, вырашальную ролю тут мела тое, што адносіны Ягайлы з Андрэем перапляліся з яго адносінамі з Кейстутам.

Ягайла і Кейстут

Хоць Кейстут выступаў у сваёй дзейнасці як выразнік і абаронца інтарэсаў усёй заходняй часткі дзяржавы, аднак сваім князем яго найперш бачыла Жамойць, паказчыкам чаго з'яўлялася яго рэзідэнцыя ў Троках. Як вядома, раней жамойцкія вярхі супрацiўляліся вялікакняскай уладзе. Так было, напрыклад, пры Віценю ў 1293—1294 гг. Аднак, калі Гедзімін задушыў жамойцкі сепаратысцкі рух на чале з Пялюзам, у жамойцкай знаці паступова пачало расці ўсведамленне значнасці іх зямлі ў дзяржаве, а адначасова і імкненне заняць віднае, а то і вядучае месца ў ёй. Менавіта Кейстут за час свайго княжання і стаў увасабленнем гэтых палітычных памкненняў жамойтаў.

Пакуль вялікім князем быў Альгерд, Кейстут, разумеючы сваё бяссілле перад яго выдатнай постаццю і магутнай уладай, мірыўся са сваім падначаленым становішчам. Аднак пасля смерці Альгерда і ўмацавання Ягайлы, Кейстут і вырашыў выкарыстаць Ягайлаву барацьбу з палачанамі (якая ўскладняла становішча новага вялікага князя) для ўзвышэння становішча Жамойці праз узвышэнне сваёй улады. Але частыя прыезды Кейстута з Трокаў у Вільню, дзе ён імкнуўся даваць вялікаму князю розныя парады ў кіраванні дзяржавай, адразу насцярожылі Ягайлу. Ён, як і Альгерд, будучы гаспадаром Княства, найперш быў выразнікам інтарэсаў усходняй, беларускай, часткі дзяржавы. І гэта зразумела, бо Альгерд аддаў яму ўсе ўладанні, якія яму належалі (Крэва, Віцебск і ўсе іншыя гарады)[181], і таму ў частых прыездах Кейстута і яго парадах Ягайла

адразу ўбачыў імкненне троцкага князя навязаць яму палітыку, патрэбную жамойцкай знаці. Зразумела, што Ягайла не мог паступіцца інтарэсамі большай часткі дзяржавы і таму стаў супрацiўляцца Кейстуту.

Убачыўшы ў імкненнях Кейстута і жамойтаў пагрозу сваёй вялікакняскай уладзе, Ягайла пачаў рыхтавацца да барацьбы з ім. Гэтае палітычнае ўнутрыдзяржаўнае суперніцтва знешне выяўлялася як чыста асабісты канфлікт. У прыватнасці, Кейстут быў вельмі зняважаны тым, што сваю сястру (а Кейстутаву пляменніцу) Ягайла выдаў за Вайдылу, чалавека простага, «хлопа», якога ўзвысіў яшчэ Альгерд і якому вялікую моц у дзяржаве даў Ягайла. Убачыўшы непрыязнасць Кейстута да сябе, Вайдыла, як паказваюць некаторыя крыніцы, і пачаў распальваць у Ягайлы нянавісць да дзядзькі і нават намовіў пайсці на саюз з крыжакамі супроць Кейстута[182]. У сваю чаргу, адзін з крыжакоў, што быў кумам Кейстута паведаміў яму аб зносінах Ягайлы праз Вайдылу з крыжакамі. Кейстут паставіў у вядомасць свайго сына Вітаўта, але той, будучы ў вялікай дружбе з Ягайлам, не паверыў гэтым звесткам.

Менавіта ў той час Ягайла і паслаў сваё войска на Полацк, каб пасадзіць там Скіргайлу, што і выкарыстаў Кейстут. Ён, сабраўшы свае палкі, прыйшоў у Вільню і захапіў Ягайлу і яго маці. Тут жа ён выявіў і паперы, якія даказвалі змову Ягайлы з крыжакамі. Захоплены быў і Вайдыла, якога па загаду Кейстута павесілі на шыбеніцы. Аднак з Ягайлам і з ягонай маці абыходжанне было больш гуманнае. Кейстут пакінуў яго на волі і аддаў яму ўсе ягоныя ўладанні і казну. Спачатку Ягайла накіраваўся ў Крэва, куды яго суправаджаў Вітаўт, а адтуль — у Віцебск.

Вось у гэты час, як сведчаць крыніцы, і была знятая аблога Полацка. Кейстут, захапіўшы Вільню, а тым самым і вярхоўную ўладу, адправіў у Полацк і ў войска, якое абложыла яго, паслоў, якія паведамілі там аб паражэнні Ягайлы. Пачуўшы пра гэта, войска адышло з Полацка ў Вільню, а Скіргайла, застаўшыся ні з чым, вымушаны быў бегчы да крыжакоў.

Як вядома, у свой час Кейстут паслаў Ягайлу ваяваць супроць Андрэя. Цяпер жа ён вырашыў мець у асобе Андрэя саюзніка, а не ворага, і таму аддаў яму Полацк. Аднак аўтар «Хронікі Быхаўца» лічыць Анд-

рэя (ён яго называе Гарбатым, што магло быць у сапраўднасці) сынам Кейстута і законным гаспадаром Полацка[183]. Гэта не памылка аўтара «Хронікі Быхаўца», як лічыў М. Улашчык[184], а свядомая фальсіфікацыя фактаў. Гэта яшчэ адзін прыклад таго, як у летапісах XVI ст. (тады і была створана «Хроніка Быхаўца») скажалася палітычная гісторыя Вялікага княства Літоўскага ва ўгоду жамойцкай знаці, якой прыпісвалася галоўная роля ва ўтварэнні дзяржавы. Паколькі асабліва важна было паказаць падначаленне Полацка жамойцкім князям, насуперак праўдзівым звесткам Андрэй і быў паказаны сынам Кейстута. З гэтай жа прычыны Кейстут ідэалізаваўся як князь Жамойці, і ўсяляк прыніжаўся Ягайла як князь беларускай часткі дзяржавы[185].

Як бачым, падзеі пацвердзілі шырокія палітычныя амбіцыі Кейстута, якія былі выяўленнем яго імкненняў заняць вядучае месца ў дзяржаве. Менавіта з гэтага часу, а не з часу Міндоўга, пачынаецца паступовае ўзвышэнне літоўскіх (у сучасным значэнні гэтага слова, а тады — жамойцкіх) земляў. Кейстут і з'явіўся фактычна першым іх князем, аднак адзіным і нядоўгачасовым.

Як Кейстут выкарыстаў адсутнасць войск Ягайлы ў Вільні (яны былі пад Полацкам) для захопу ўлады, так цяпер зрабіў і Ягайла, выкарыстаўшы для захопу ўлады адсутнасць войск Кейстута. Гэтыя войскі былі накіраваныя пад Наваград-Северскі, дзе княжыў Дзмітрый Карыбут, што аддаўся пад уладу Масквы. Загадана было ісці туды і Ягайлу. Аднак ён, забыўшыся аб сваёй прысязе Кейстуту «николи противу его не стояти и завжды в его воли быти»[186], не пайшоў з Кейстутам, а стаў падбухторваць віленскіх мяшчанаў праз якіхсьці «слуг Гаставых», пад якімі некаторыя даследчыкі разумеюць нямецкіх мяшчанаў у Вільні[187]. Сам жа Ягайла са сваім войскам прыімчаўся з Віцебска ў Вільню, а адтуль пайшоў у Трокі, куды на злучэнне з ім ішлі прускія крыжакі. Не спадзеючыся вытрымаць такі націск, Трокі, якія былі рэзідэнцыяй Кейстута (таму туды і накіраваўся Ягайла), адразу здаліся. У сваю чаргу Кейстут, якому аб усім, што адбывалася, паведаміў Вітаўт, накіраваўся з-пад Ноўгарад-Северскага ў Гародню, дзе быў і Вітаўт.

Вітаўт паспадзяваўся на дапамогу свайго зяця Януша Мазавецкага. Аднак усё адбылося наадварот. Януш Мазавецкі, карыстаючыся дзяржаўным замяшаннем у Вялікім княстве Літоўскім, пайшоў з войскам у Берасцейскую зямлю, якой валодаў Кейстут, захапіў шэраг яе гарадоў (Берасце ўзяць не змог), пасля чаго вярнуўся назад, пакінуўшы ў Драгічыне і Мельніку свае гарнізоны.

Трэба заўважыць, што менавіта гэтыя падзеі добра высветлілі становішча Кейстута найперш як князя Жамойці. І таму зразумела, чаму ён у крытычны момант сабраў вакол сябе «усю Жамойцкую зямлю і войскі» і пайшоў да Вяллі, дзе хутка злучыўся з войскам Вітаўта і разам з ім падышоў да Трокаў і ўзяў замак у аблогу. Сюды ж з войскам прыйшоў і Ягайла, а таксама яго саюзнікі — прускія і лівонскія крыжакі. І вось калі абодва войскі падрыхтаваліся да бітвы, ад Ягайлы з'явіліся паслы, якія прапанавалі не ўступаць у бой і закончыць справу мірам, каб «ён (Кейстут) трымаў сваё, а мы (Ягайла) сваё»[188]. Паслы далі прысягу Вітаўту, якую ён прыняў. Прыняў яе і Скіргайла, які выступаў на баку Ягайлы. Далей гэтая прысяга была паўторана Кейстуту — што ні яму, ні яго сыну Вітаўту нічога благога не будзе зроблена, калі яны прыедуць да Ягайлы, каб заключыць мір. Аднак Ягайла парушыў прысягу. Калі Кейстут і Вітаўт з'явіліся да Ягайлы, ён прапанаваў ім паехаць у Вільню і там заключыць дагавор аб міры. Не прадбачачы нічога небяспечнага, Кейстут, гэтаксама як і Ягайла, распусціў сваё войска. Але пасля прыезду ў Вільню Ягайла захапіў Кейстута і Вітаўта, адправіў іх у Крэва і пасадзіў у вежу. На пятую ноч Кейстут быў задушаны. Захаваліся імёны князевых забойцаў: імі былі каморнікі Ягайлы — Прокша, які даваў яму ваду, а таксама крыжак-манах Мостэр, Кучук і Лісіца Жабянцяй[189].

Так трагічна закончылася жыццё гэтага даволі даўгавечнага палітыка. Само сабой паўстае пытанне: «Выпадковым ці заканамерным быў такі канец?» Ужо адзначалася тэндэнцыйнасць аўтара «Хронікі Быхаўца» ў паказе ўзаемаадносін Ягайлы і Кейстута, калі першы паўставаў выключна ў чорных фарбах, а другі — у светлых. На жаль, некаторыя гісторыкі (П. Бранцаў, В. Даніленіч) прымалі ўсё гэта за чыстую праўду і адпаведна

характарызавалі памянёных асобаў. Але нягледзячы на старанне ўсю віну за жорсткасці ўскласці на Ягайлу, хроніка не магла схаваць таго факта, што менавіта Кейстут пачаў барацьбу з Ягайлам, а не наадварот. Як ні распісвалася тут дабрыня Кейстута, хроніка тым не менш адзначыла, што ён загадаў узвесці на шыбеніцу Вайдылу.

Яшчэ невядома, ці адпавядае сапраўднасці тое, што Ягайла быў высланы спачатку ў Крэва, а потым у Віцебск, бо маюцца звесткі, што ён быў сасланы Кейстутам у Полацк, дзе прасядзеў у турме болей года[190]. Ужо гэтыя схаваныя ўслужлівымі храністамі факты могуць казаць аб іншым палітычным і чалавечым абліччы Кейстута. Таму, ці такой ужо выключнай падзеяй з'яўляецца жорсткая расправа Ягайлы з Кейстутам. Успомнім, як Віцень у 1293—1294 гг. жорстка расправіўся з жамойцкімі старшынамі, што паўсталі супроць яго і хацелі схіліцца на бок крыжакоў. Гэтак жа і Гедзімін бязлітасна абышоўся з тымі ж жамойтамі і іх важаком Пялюзам, якія таксама доўгі час супраціўляліся вялікакняскай уладзе. Дык ці варта пасля гэтага здзіўляцца падступнасці і жорсткасці Ягайлы ў абыходжанні з Кейстутам.

Але калі Віцень і Гедзімін распраўляліся з жамойцамі за іх сепаратысцкія намеры, то Ягайла паўстаў супроць Кейстута за яго гегеманісцкія памкненні, а дакладней, за спробу вывесці Жамойць на першае месца ў дзяржаве. З гэтым Ягайла (як і ягоны бацька Альгерд) не мог згадзіцца, бо, будучы вялікім князем, найперш выяўляў інтарэсы ўсходніх, г. зн. беларускіх земляў. Ягайла добра бачыў тую спрыяльную глебу, якая жывіла дзейнасць Кейстута, а менавіта жамойцкую язычніцкую партыю, што групавалася вакол Кейстутавай жонкі Біруты — заўзятай язычніцы і былой вайдэлоткі. Вось чаму Ягайла пакараў не толькі Кейстута, але і многіх жамойцкіх баяраў, а найперш род Біруты: яе дзядзька Відзімонт, быў «на колах разбіты», а двум другім дзядзькам адсеклі галовы. Сама Бірута была прысуджаная да ўтаплення ў Нёмане, але ёй удалося нейкім чынам вызваліцца ад кары, і яна памерла ў 1416 г.[191]. Праўда, тут гаворыцца, што ўсё гэта Ягайла рабіў, помсцячы за Вайдылу. Аднак зразумела, што пад гэтым, як і ва ўсёй гісторыі з Вайдылам, хавалася жорсткая палітычная барацьба за вядучае месца ў дзяржаве.

Усё адзначанае паказвае, што менавіта з Кейстута пачынаецца ўзвышэнне літоўскай (паўтараем: у сучасным значэнні гэтага слова, а тады — жамойцкай) часткі дзяржавы. Аднак яе імкненне выйсці на першае месца закончылася жорсткім паражэннем, што і вызначыла трагічны фінал жыцця Кейстута.

Ягайла і Вітаўт

Такі ж трагічны лёс чакаў і Вітаўта. Ён таксама быў прывезены ў Крэва з жонкаю, змешчаны ў асобным пакоі, дзе яго пільна вартавалі, аднак ім удалося ашукаць вартавых і выйсці з замка, пасля чаго князь уцякае да крыжакоў праз Берасце і Мазовію і прыбывае ў Прусію, дзе яго прыязна сустракае вялікі магістр ордэна Конрад.

Спачатку магістр Конрад Чольнер у адказ на просьбу Вітаўта дапамагчы яму ў барацьбе з Ягайлам зрабіў спробу прымірыць іх. У сваім лісце да Ягайлы ён у ліку іншага прасіў Ягайлу вярнуць хоць частку ўладанняў, што належалі Вітаўту. Аднак Ягайла адмовіўся і, у сваю чаргу, прасіў вялікага магістра не хваляваць жамойтаў, якія з'яўляюцца яго падданымі. Гэта для нас асабліва важна, бо паказвае, што па-ранейшаму для Ягайлы галоўным было захаваць пад сваёй уладай Жамойць (Жмудзь). Хоць ён і згадзіўся на сустрэчу з вялікім магістрам, аднак яна не адбылася, паколькі апошні не прыехаў ва ўмоўленае месца, а Ягайла не захацеў ехаць на новае месца. Пасля зрыву сустрэчы вялікі магістр піша Ягайлу ліст, у якім рашуча абвінавачвае яго ў прысваенні часткі Самагіціі (так па-лацінску называлася Жамойць-Жмудзь). Зноў, як бачым, жамойцкае пытанне выступае ў гэтым канфлікце як галоўнае.

І вось у жніўні 1380 г. вялікае крыжацкае войска, а таксама Вітаўт з жамойцкім атрадам увайшлі на тэрыторыю Вялікага княства Літоўскага. Але крыжацкае войска, узяўшы Трокі і парабаваўшы ваколіцы, вярнулася назад. Па ўсім відаць, што для крыжакоў

было больш важна парабаваць, чым дапамагчы Вітаўту. Адразу ж пасля адыходу крыжакоў, Ягайла зноў займае Трокі, што зразумела, бо яны былі ключом да валодання Жамойцю.

Вядома, такі вынік крыжацкай дапамогі не мог задаволіць Вітаўта, але, каб разлічваць на далейшую падтрымку, ён павінен быў пайсці на чарговыя ўступкі і ахвяраванні. Калі першы раз ён згадзіўся (пры ўмове сваёй перамогі над Ягайлам) стаць васалам Ордэна, то цяпер даў абяцанне аддаць крыжакам Жамойць. Апроч таго, ён павінен быў ахрысціцца ў каталіцкую веру, што і адбылося 21 кастрычніка 1383 г.

Усё гэта задавальняла вялікага магістра, і ўвосень 1383 г. ён распачаў супроць Ягайлы ваенныя дзеянні. Крыжакі ўварваліся на тэрыторыю Вялікага княства Літоўскага і недалёка ад Кернавы ўзялі разбураную крэпасць Марыенвэрдар, дзе і адбылося новае пацверджанне раней падпісаных умоў паміж вялікім магістрам і Вітаўтам, прычым князь узяў на сябе новыя абавязацельствы. Вайна ў перспектыве набывала зацяжны характар, і таму кожны з бакоў не быў упэўнены ў сваёй перамозе. Вітаўт нават і пры ўмове сваёй перамогі прадбачыў сваю залежнасць ад Ордэна. Для Ягайлы ж гэтая вайна магла скончыцца агульным аслабленнем дзяржавы, што магло прывесці і да яе развалу. Вось чаму менавіта ён звярнуўся да Вітаўта з мірнаю прапановай (ёсць звесткі, што ён быццам бы зрабіў гэта па радзе сваёй маці Юльяны). Праўда, Вітаўт мог разлічваць на мір толькі пры згодзе парваць з Ордэнам, на што ён і згадзіўся, пачаўшы разам з Ягайлам змагацца супроць крыжакоў.

Асаблівую ўвагу прыцягвае той факт, што Вітаўт, атрымаўшы ад Ягайлы Гарадзенскую і Берасцейскую землі і Луцк, пераходзіць з каталіцтва, якое ён прыняў зусім нядаўна ва ўгоду Ордэну, у праваслаўе. Па-першае, гэта характарызуе Вітаўта як дзяржаўнага дзеяча, што кіраваўся адпаведнымі палітычнымі абставінамі, якія складваліся ў той ці іншы час. Змагаючыся разам са сваім бацькам Кейстутам супроць Ягайлы, ён адстойваў інтарэсы Жамойці. Аднак пасля гібелі Кейстута, уступіўшы ў саюз з Ордэнам для далейшай барацьбы з Ягайлам, ён ахвяруе і Жамойцю, і язычніцтвам. Затым, памірыўшыся з Ягайлам і атрымаўшы ад яго землі

з праваслаўным насельніцтвам, ён ахвяруе каталіцтвам і прымае праваслаўе. Гэты факт прымушае нас зноў вярнуцца да становішча Кейстута, які адначасова валодаў і язычніцкай Жамойцю і праваслаўнымі Гарадзеншчынай і Берасцейшчынай.

Ці маглі гэтыя землі мірыцца з тым, што іх князем быў язычнік? У святле прыняцця Вітаўтам праваслаўя адказ можа быць толькі адзін: не маглі.

А цяпер згадаем, як жа тады паводзіў сябе Кейстут? Найверагодней, што ён вымушаны быў выступаць у двух абліччах: перад праваслаўнымі — як праваслаўны, перад язычнікамі — як язычнік. Але паколькі ён больш часу праводзіў у Троках, то, вядома, больш знаходзіўся пад уплывам язычніцкага акружэння (асабліва з боку роду жонкі Біруты), што і стварыла пра яго ўяўленне як пра князя-язычніка. Такая акалічнасць не магла адмоўна не ўздзейнічаць на праваслаўныя ўладанні Кейстута, якія не аказалі яму падтрымкі ў барацьбе з Ягайлам, што і з'явілася адной з прычын яго паражэння. Усё гэта ўбачыў Вітаўт, што і прымусіла яго змяніць каталіцтва на праваслаўе, бо з князем, які быў у язычніцтве, не маглі б мірыцца ні Гародзеншчына, ні Берасцейшчына.

Але Вітаўт, атрымаўшы гэтыя дзве зямлі, якія належалі яго бацьку, не забыўся і аб Троцкім княстве (фактычна яно было галоўным бацькавым уладаннем) і, вядома ж, прэтэндаваў на яго. З гэтым не мог пагадзіцца Ягайла, які прадбачыў, што ў такім разе Жамойць, атрымаўшы Вітаўта, якога яна ўспрымала як свайго законнага князя, зноў уздыме барацьбу за вядучае месца ў дзяржаве. Менавіта суперніцтва Ягайлы і Вітаўта за Троцкае княства пагражала зноў разгарэцца ў зацяжную ўнутраную барацьбу. Зразумела, што Ягайла трывожыўся і шукаў для сябе моцнай падтрымкі, якая магла паказаць Вітаўту марнасць ягоных намераў.

І ўсё ж пагроза доўгай унутранай барацьбы, якой бы яна небяспечнай ні была, блякла перад грознай знешняй небяспекай. Менавіта перавага адмоўных знешніх фактараў над унутранымі цяжкасцямі і з'явілася важнейшай адметнасцю Вялікага княства, што ў далейшым найперш і садзейнічала яго заняпаду. Той трохкутнік, які ўжо вызначаўся пры Гедзіміне, сціскаўся ўсё больш пагрозліва. З паўночнага захаду — крыжацкая агрэсія,

з захаду — націск Польшчы, у вярхах якой ужо выспеў план падначалення суседняй краіны, а на ўсходзе ўжо пачала паступова заваёўваць суседнія з ёю ўладанні Вялікага княства Масква. Апынуўшыся ў такім акружэнні, наша дзяржава не магла весці паспяховай барацьбы з усімі варожымі сіламі адразу і мусіла шукаць разумнага кампрамісу. Ім і стала Крэўская ўнія, якая істотна змяніла кірунак дзяржаўнага жыцця і тым самым адкрыла новы этап нашага гістарычнага шляху.

Як бачна з разгледжанага, віленскі перыяд быў асабліва спрыяльны і плённы ў нашай гісторыі. Гэта быў час, калі наша дзяржава ў сваёй унутранай і знешняй палітыцы кіравалася толькі сваімі інтарэсамі, а значыць — адзін з перыядаў яе найбольшай самастойнасці.

Галоўным яго вынікам быў найперш імклівы тэрытарыяльны рост Вялікага княства, асабліва ў часы Альгерда, калі ён, выкарыстаўшы спрыяльную знешнепалітычную кан'юнктуру, далучыў да сваіх уладанняў шэраг новых земляў, павялічыўшы ўладанні больш чым у два разы.

Віленскі перыяд асабліва спрыяльны быў для беларускіх земляў, якія канчаткова аб'ядналіся і тым самым замацавалі сваё цэнтральнае месца ў дзяржаве, у выніку чаго, паводле вобразнага выразу Ф. Багушэвіча, Беларусь была тут, «як зерне ў гарэху». Усё гэта спрыяла хутчэйшай кансалідацыі беларускай народнасці, далейшаму развіццю яе культуры і канчатковаму фармаванню яе мовы, якая па-ранейшаму прадаўжала быць у Вялікім княстве Літоўскім дзяржаўнай.

Перанясенне сталіцы з Навагародка ў Вільню не толькі не зменшыла беларускага характару дзяржавы, але яшчэ больш умацавала яго. Сталічнае значэнне Вільні актыўна садзейнічала далейшай беларускай асіміляцыі балцкага насельніцтва, што і ператварыла Віленшчыну ў беларускі край ужо тады. Тым самым побач з пашырэннем тэрыторыі Беларусі на ўсходзе ішоў такі самы працэс і на захадзе. Усё гэта яшчэ раз паказвае, што ніякага літоўскага (у сучасным значэнні гэтага слова) панавання над беларускімі землямі ў тыя (як і ў ранейшыя) часы не было. Усё адбывалася наадварот: ішло далейшае падначаленне балцка-літоўскіх земляў вярхоўнай уладзе, і усялякае іх супраціўленне ці імкненне заняць у дзяржаве больш высокае месца жорстка караліся. Калі беларуская тэрыторыя і беларускае насельніцтва ўсё больш павялічваліся, то балцка-літоўскія землі і балцка-літоўскае насельніцтва ўвесь час змяншаліся. Усё гэта яшчэ раз яскрава паказвае, што не балцка-літоўскія, а беларускія землі займалі ў Вялікім княстве Літоўскім пануючае месца, што па-ранейшаму вызначала яго як беларускую дзяржаву.

Зацемкі

1 Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Мн., 1990. С. 346—347.
2 Полное собрание русских летописей (ПСРЛ). Т. 32. М., 1975. С. 137—138.
3 Голубович В., Голубович Е. Кривой Город — Вильно. М., 1945. С. 125.
4 Тамсама. С. 124, 125.
5 Slownik geograficzny ziem polskich. T. 4. Warszawa, 1884. S. 666, 814.
6 Scriptores rerum Prussicarum. Leipcig, t. II, p. 623.
7 Ушинскас В. Формирование раннегосударственной территории Литвы X — XII вв. Л., 1988. С. 15.
8 Letuwies torbine enciclopedija. Wilnius, 1976. T. 1. P. 463.
9 Послания Гедимина. Вильнюс. С. 64, 68.
10 Letuwies torbine enciclopedija. Wilnius, 1976. T. 1. P. 463.
11 ПСРЛ. Т. 32. С. 32, 35.
12 Тамсама. Т. 17. СПб., 1908. С. 593—596.
13 Пашуто В. Образование Литовского государства. М., 1959. С. 76.
14 ПСРЛ. Т. 2. М., 1962. С. 12.
15 Тамсама. Т. 17. С. 574.
16 Slownik georgaficzny. T. 13. С. 499.
17 ПСРЛ. Т. 17. С. 595.
18 Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. С. 332—333.
19 ПСРЛ. Т. 32. С. 211; Т. 35. С. 286.
20 Юргевич В. Опыт объяснения имен князей литовских / Чт. в Имп. об-ве истории и древностей Российских. 1883. Кн. 3. С. 27.
21 ПСРЛ. Т. 32. С. 136.
22 Русско-Ливонские акты. СПб., 1857. С. 30.
23 Васильевский В. Переход Гедимина в католичество // Журн. мин-ва народн. просвещ. № 1. СПб., 1872. С. 144.
24 Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т. 1. С. 97.
25 ПСРЛ. Т. 32. С. 136.
26 Dusburg Petri. Chronica terrae Prussiae. T. 3. С. 305, 317.
27 ПСРЛ. Т. 2. СПб., 1843. С. 207.
28 Тамсама. Т. 32. С. 35.
29 Васильевский В. Очерк истории города Вильны // Памятники русской старины в западных губерниях Империи. Вып. 5. Вильно, 1872. С. 11.
30 ПСРЛ. Т. 32. С. 136.
31 Послания Гедимина. Вильнюс, 1966. С. 30.

32 Антонович В. Монографии. Киев, 1878. С. 47.
33 ПСРЛ. Т. 17. С. 573.
34 Тамсама. С. 590—591.
35 Тамсама. Т. 2. 1843. С. 202.
36 Тамсама. Т. 32. С. 136—137.
37 Антонович В. Монографии. Киев. 1878. С. 47—51.
38 Dusburg Petri. Цыт. твор.
39 Антонович В. Монографии. Киев. 1878. С. 43—44.
40 Татищев В. История российская. Т. 1. М.; Л., 1962. С. 111.
41 Никжянтайтис А. Гедиминас // Вильнюс, 1990. № 4.
42 Брянцев П. История Литовского государства. Вильно, 1890. С. 124.
43 Псковские летописи. Вып. 1. М.; Л., 1941. С. 15.
44 Тамсама. С. 15—16.
45 Тамсама. Вып. 2. М., 1955. С. 23.
46 ПСРЛ. Т. 3. СПб., 1846. С. 77.
47 Послания Гедимина. С. 168—170.
48 Тамсама. С. 28, 50.
49 ПСРЛ. Т. 3. 1846. С. 73—74.
50 Ермаловіч М. Вузел загадак // Полымя. 1988. № 10.
51 Данилевич В. Очерки истории Полоцкой земли. Киев, 1896. С. 151—152.
52 Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. С. 348—349.
53 Полоцкие грамоты. Вып. 1. М., 1977. С. 39.
54 ПСРЛ. Т. 2. 1843. С. 341.
55 Тамсама. С. 342.
56 Тамсама. С. 251.
57 Тамсама. С. 203.
58 Тамсама. С. 346.
59 Русско-Ливонские акты. С. 21.
60 Тамсама.
61 Послания Гедимина. С. 27.
62 Тамсама. С. 88.
63 Васильевский В. Переход Гедимина в католичество. С. 172.
64 Послания Гедимина. С. 126—128.
65 Тамсама. С. 144.
66 Тамсама. С. 138.
67 Тамсама. С. 140.
68 Васильевский В. Переход Гедимина в католичество. С. 186.
69 История Ливонии. Т. 2. Рига, 1885. С. 225.
70 Послания Гедимина. С. 120—121.
71 Никжянтайтис А. Гедиминас // Вильнюс. 1990. № 4.
72 Послания Гедимина. С. 30.
73 Тамсама. С. 54.
74 ПСРЛ. Т. 32. С. 138.
75 История Ливонии. Т. 2. С. 202.
76 Тамсама. С. 201—202.
77 Тамсама. С. 204.
78 Тамсама.
79 Тамсама.
80 Тамсама. С. 225.
81 Никжянтайтис А. Гедиминас // Вильнюс. 1990. № 4.
82 Тамсама. С. 150—151.
83 Тамсама. С. 150.

84 История Ливонии. Т. 2. С. 228.
85 Антонович В. Монографии. Киев. 1878. С. 43.
86 История Ливонии. Т. 2. С. 239.
87 ПСРЛ. Т. 32. С. 41—42.
88 Антонович В. Монографии. Киев. 1878. С. 74.
89 ПСРЛ. Т. 32. С. 138.
90 Антонович В. Монографии. Киев. 1878. С. 76.
91 ПСРЛ. Т. 32. С. 173.
92 Narbutt T. Dzeje starozytne narodu litewskiego. T. IV. C. 267.
93 Никжянтайтис А. Кто погиб под Баербургом // Тр. АН Лит ССР, серия общ. наук. 1987. № 1 (98). С. 31—43.
94 Псковские летописи. Вып. 1. С. 18; Вып. 2, С. 24.
95 Тамсама. Вып. 1. С. 18.
96 Никжянтайтис А. Гедиминас // Вильнюс. 1990. № 4,
97 Русско-Ливонские акты. С. 13.
98 ПСРЛ. Т. 11. С. 174.
99 Псковские летописи. Вып. 1. С. 19; Вып. 2. С. 25.
100 Тамсама. Вып. 2. С. 25—26.
101 Тамсама. С. 26.
102 Тамсама.
103 Данилевич В. Монографии. Киев. 1878. С. 158.
104 Полоцкие грамоты. Вып. 1. С. 39.
105 ПСРЛ. Т. 32. С. 138.
106 Тамсама. Т. 2. Спб., 1843. С. 350.
107 Тамсама. Т. 32. С. 136.
108 Тамсама.
109 Тамсама. С. 138.
110 Тамсама.
111 Тамсама. Т. 3. Спб., 1841. С. 83.
112 Тамсама. Т. 11. С. 190.
113 Псковские летописи. Вып. 1. С. 20—21; Тамсама. Вып. 2. С. 26—27.
114 Антонович В. Монографии. Киев. 1878. С. 109.
115 Псковские летописи. Вып. 2. С. 25—26.
116 Тамсама. С. 27.
117 Тамсама.
118 Тамсама.
119 ПСРЛ. Т. 3. Спб., 1841. С. 83.
120 Новгородская IV летопись. С. 58.
121 Тамсама.
122 Тамсама.
123 ПСРЛ. Т. 7. Спб., 1856. С. 216.
124 Дыялекталагічны атлас Беларусі. Мн.. 1968. Карта VII.
125 ПСРЛ. Т. 11. М., 1965. С. 207.
126 Тамсама. С. 211.
127 Тамсама. С. 213.
128 Тамсама. Т. 12. С. 19.
129 Тамсама. С. 20.
130 Тамсама. С. 218.
131 Тамсама. С. 21, 47.
132 Данилевич В. Е. Очерки истории Полоцкой земли. Киев, 1896. С. 158.
133 Антонович В. Монографии. Киев. 1878. С. 111.
134 ПСРЛ. Т. 11. С. 106.

135 Тамсама. С. 172.
136 Тамсама. С. 207.
137 Дыялектычны атлас Беларусі. Карта VII.
138 ПСРЛ. Т. 11. С. 187.
139 Тамсама. С. 191—192.
140 Тамсама. С. 211, 218.
141 Тамсама. Т. 12. С. 15—17.
142 Тамсама. С. 19—20.
143 Тамсама. С. 20—22.
144 Тамсама. С. 26—28.
145 Тамсама. С. 28—36.
146 Danilowicz J. Skarbiec dyplomatyczny. T. 1. C. 218.
147 ПСРЛ. Т. 12. С. 217—218.
148 Danilowicz J. Skarbiec dyplomatyczny. T. 1. C. 170.
149 Jana Dlugosza. Rocznik kroniki slawnego Krolewstwa Polskiego. C. 1090—1092.
150 Danilowicz J. Skarbiec dyplomatyczny. T. 1. C. 198.
151 Тамсама. С. 196—197.
152 ПСРЛ. Т. 32. С. 139.
153 Тамсама. С. 43—44.
154 Тамсама. С. 43.
155 Тамсама. С. 139.
156 Тамсама. С. 43.
157 Narbutt T. Dzeje starozytne narodu Litewskiego. T. IV. C. 267.
158 ПСРЛ. Т. 32. С. 43.
159 ПСРЛ. Т. 2. 1843. С. 350.
160 ПСРЛ. Т. 32. С. 43.
161 Naruszewicz. Historia ludu polskiego. T. IX. C. 245—247.
162 Jana Dlugosza. Цыт. твор. Т. X. С. 35—36.
163 ПСРЛ. Т. XI. С. 178.
164 Карамзин Н. История государства Российского. Т. 5. 1884. Заўвага 44.
165 ПСРЛ. Т. 32. С. 193.
166 Narbutt T. Dzeje starozytne narodu Litewskiego. T. IV. C. 236—237.
167 Брянцев П. История Литовского государства. Вильно. 1890. С. 180.
168 Schriptores rerum Prussicarum. T. 11. Leipzig. 1835. C. 110.
169 Данилевич В. Монографии. Киев. 1878. С. 162.
170 Cronika Wigand i Marburgen. C. 591.
171 ПСРЛ. Т. 3. С. 91.
172 Тамсама.
173 Татищев В. История Российская. Т. IV. С. 255.
174 Данилевич В. Монографии. Киев. 1878. С. 164.
175 Новгородская IV летопись. С. 75.
176 Тарасов К. Память о легендах. Мн., 1984. С. 38.
177 Тамсама. С. 26—27.
178 Повесть о Куликовской битве. М., 1959. С. 283.
179 Тарасов К. Память о легендах. С. 27.
180 ПСРЛ. Т. 3. С. 92.
181 Хроника Быховца. М., 1966. С. 62.
182 ПСРЛ. Т. 32. С. 62.
183 Хроника Быховца. С. 60.
184 Тамсама. С. 133, 135.

[185] Хроника Быховца. С. 60—64.
[186] Тамсама. С. 62
[187] Тамсама. С. 134.
[188] Тамсама. С. 63.
[189] Тамсама. С. 64.
[190] Данилевич В. Монографии. Киев. 1878. С. 166. Заўвага 109.
[191] Хроника Быховца. С. 64.

Змест

Мэта выдавецкага цэнтра

«БАЦЬКАЎШЧЫНА»

— праз добрую кнігу спрыяць павазе беларусаў да сваёй гісторыі, культуры і мовы, абуджаць нацыянальную годнасць.

Гэтаму якраз і служыць самаахвярная праца Міколы Ермаловіча. Яго гістарычнае даследаванне «Старажытная Беларусь. Полацкі і Новагародскі перыяды» імгненна разышлося, вучыць сённяшніх беларусаў ведаць сваю мінуўшчыну, шанаваць родны край.

Працягам той кнігі з'яўляецца нарыс «Віленскі перыяд», прысвечаны часу, калі старажытнабеларуская дзяржава стала адной з самых магутных краін тагачаснай Еўропы.

Выдавецкі цэнтр

«БАЦЬКАЎШЧЫНА»

выказвае шчырую ўдзячнасць Злучанаму Беларуска-Амерыканскаму Дапамогаваму Камітэту за спрыянне ў выданні гэтай кнігі, асабіста сп. Віталю Цярпіцкаму, а таксама сям'і Пашкевічаў з Канады і сп. Паўлу Урбану з Нямеччыны за дапамогу ў развіцці беларускамоўнай выдавецкай справы, за бескарыслівы ўклад у духоўнае Адраджэнне роднага народа.

Наш адрас: 220053, Беларусь, Менск, Даўгінаўскі тракт, д. 52/9. Т. 37-05-44.

Навуковае выданне

Ермаловіч Мікола Іванавіч

Старажытная Беларусь

Віленскі перыяд

Адказны за выпуск Яўген Лецка.

Здадзена ў набор 16.12.93. Падп. да друку 16.02.94. Фармат $84 \times 108^{1}/_{32}$. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ул. выд. арк. 4,98. Ум. друк. арк. 5,04. Тыраж 25 000 экз. Зак. 639.

Выдавецкі цэнтр «Бацькаўшчына», МП «Бесядзь». Ліцэнзія ЛВ № 82. 220053, Мінск, Даўгінаўскі тракт, 52/9.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск. Чырвоная, 23.